ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1983
10
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 9 (1385)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

тэлетайп

• Учора • Сёння • Заўтра •

### СУСТРЭЧА З ЖУРНАЛІСТАМІ

БЕЛТА прайшла на факультэце журналістыкі. Я. Р. Гарэлік — галоўны рэдактар галоўнай рэдакцыі інфармацыі, П. М. Пабока — загадчык рэдакцыі спецыяльнага выпуску для раённых і шматтыражных газет азнаёмілі студэнтаў са структурай Тэлеграфнага агенцтва, спецыфікай работы рэдакцый.

**А. МАКСІМАВА,**
студэнтка факультэта журналістыкі.

### СПАБОРНІЦТВЫ БАРЦОЎ

у праграме VIII летняй спартакіяды г. Мінска прайшлі ў Палацы спорту «Працоўныя рэзервы». Зборная каманда універсітэта выступала ў саставе 8 чалавек. Чэмпіёнамі спартакіяды сталі студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі Сяргей Тырсікаў (у вазе да 48 кг) і слухач падрыхтоўчага аддзялення Камандар Маджыдаў (да 68 кг). Студэнт геаграфічнага факультэта Алег Хранека заняў другое месца (да 62 кг).

**В. РУДЗЯНКОЎ,**
старшы выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

### НА РАСШЫРАНЫМ ПЛЕНУМЕ

прафсаюзнага камітэта супрацоўнікаў разгледжаны вынікі выканання пагаднення па ахове працы і тэхніцы бяспекі паміж адміністрацыяй і прафсаюзным камітэтам. Заключана новае пагадненне на 1983 год.

На пленуме таксама зацверджаны палажэнні аб конкурсе на званне лепшага грамадскага інструктара па ахове працы і тэхніцы бяспекі і аб конкурсе па культуры вытворчасці, ахове працы і выкананню працоўнага заканадаўства.

**У. ШАЛАТОНІН,**
намеснік старшыні прафкома супрацоўнікаў.

### ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР

замежных студэнтаў у гонар Міжнароднага жаночага дня 8 Сакавіка прайшоў ва універсітэце. Шмат цёплых слоў было сказана ў адрас жанчын — нязменных барацьбітоў за раўнапраўе, шчасце і мір на зямлі.

Лепшыя замежныя студэнткі універсітэта былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі БДУ. Сярод іх Фузія Рабані (Алжыр), Юлія Бурашова (ЧССР), Гульдаста Умар (ДРА), Луіза Кабрыта (Грэцыя), Лхон Дараван (Лаос) і многія іншыя.

**У. ПУЗІКАЎ,**
намеснік дэкана па рабоце з замежнымі навучэнцамі.

**АДЗІН ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА**

## 1. СУЧАСНАСЦЬ ГІСТОРЫІ

*Ні на хвіліну не спыняецца жыццё ва універсітэцкіх аўдыторыях і лабараторыях. Мінулі напружаныя дні сесіі, залікі і экзамены. Наперадзе — вучоба, пошукі, знаходкі... Наперадзе — новы семестр. На гістарычным факультэце ён у разгары.*

*Тамара Грыбко — сакратар камітэта камсамола гістфака. Шмат клопатаў у камсамольскага важака: арганізацыя сацыялістычнага спаборніцтва паміж акадэмічнымі групамі факультэта, вучоба камсамольскага актыву, фарміраванне будаўнічых атрадаў, падрыхтоўка да агляду-конкурсу мастацкай самадзейнасці... Аднак, нягледзячы на гэта, яна ахвотна згадзілася быць нашым гідам па факультэту. І першым чынам прапанавала наведаць факультэцкія музеі — этнаграфіі і археалогіі.*

*— Яны цікавыя ўжо тым, што ўсе экспанаты сабраны студэнтамі і выкладчыкамі факультэта. Тут можна ўбачыць прылады працы нашых далёкіх продкаў, пазнаёміцца з вырабамі майстроў старажытнасці, даведацца аб побыце і занятках беларускага народа. Наведвальнікаў, безумоўна, зацікавяць клады і захаванні, якія дайшлі да нас праз вякі, сталі ўласнасцю народа. Сярод іх — вырабы з золата і серабра, адшуканыя ля вёскі Вішчын, што на Гомельшчыне. Яны дайшлі з XII стагоддзя.*

*Але галоўнае прызначэнне музеяў — удасканальванне вучэбнага працэсу. На багатым матэрыяле студэнты-гісторыкі пішуць курсавыя, абараняюць дыпломныя работы, бліжэй знаёмяцца з мінулым свайго краю.*

(Заканчэнне на 2-й стар.).





**МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ**

## БАЯВЫ АВАНГАРД

**У БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭЦЕ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА прайшла Усесаюзная справаздачна-выбарная канферэнцыя членаў Нацыянальнага Саюза Алжырскай Моладзі (НСАМ), што вучацца ў навучальных установах Савецкага Саюза.**

**Пасля канферэнцыі член ЦК партыі Фронту нацыянальнага вызвалення, надзвычайны і паўнамоцны пасол АНДР у СССР Месауд Айт Шалап, аташэ па культуры Махамед Руйгі, аспірант ФПМ Бенуар Нур-Эдзін пабывалі на прыёме ў рэктара універсітэта, акадэміка АН БССР Л. І. Кісялеўскага. На прыёме прысутнічалі таксама прарэктар па міжнародных сувязях А. В. Шарапа, намеснік сакратара партыйнага камітэта П. Л. Салаў, куратар зямляцтва алжырскіх студэнтаў У. Г. Будай.**



Многа знамянальных падзей аддзяляюць сённяшні Алжыр ад майскіх дзён 1956 года, калі алжырскія студэнты вырашылі закончыць заняткі, пакінуць навучальныя ўстановы, каб далучыцца да партызан і разам з усім народам прыняць удзел у нацыянальнай барацьбе за свабоду і незалежнасць сваёй радзімы.

Ад моладзі ў значнай ступені залежыць пераемнасць у рэвалюцыі і ў пабудове сацыялізму. Пакаленне, якое паднялося на барацьбу, вызваліла краіну ад каланіяльнага гнёту і заклала асновы для пабудовы сацыялізму, павінна перадаць свой вопыт у рукі маладых людзей, здольных зразумець яго гістарычнае значэнне і прыняць яго.

19 мая 1975 года адбылася нацыянальная канферэнцыя алжырскай моладзі, якая прыняла рашэнне аб стварэнні адзінай палітычнай маладзёжнай арганізацыі — Нацыянальнага Саюза Алжырскай Моладзі, якая бачыць сэнс сваёй дзейнасці ў ажыццяўленні рашэнняў партыі Фронту нацыянальнага вызвалення Алжыра, у ажыццяўленні праграмы пабудовы сацыялістычнага грамадства, у выхаванні моладзі ў духу рэвалюцыйных традыцый.

Асноўнай задачай НСАМ з'яўляецца аб'яднанне моладзі ў працэсе будаўніцтва новага грамадства, якое б паклала канец эксплуатацыі чалавека чалавекам. НСАМ заклікаены ўнесці свой уклад у рашэнне і спецыфічных «маладзёжных» праблем — адукацыі, прафесійнай падрыхтоўкі, актывізацыі культурна-масавай і спартыўнай дзейнасці.

Алжырская моладзь не раз даказвала сваімі справамі, што яна знаходзіцца на вышыні той адказнасці, якая на яе ўскладзена. Юнакі і дзяўчаты Алжыра рашуча адабраюць і падтрымліваюць сацыялістычную арыентацыю, што адпавядае яе ўяўленням аб сацыяльнай справядлівасці і народнай дэмакратыі.

Адной з галоўных задач НСАМ з'яўляецца барацьба за ўмацаванне міру і міжнароднай разрадкі, за ліквідацыю пагрозы ядзернай вайны, за ўмацаванне салідарнасці з моладдзю і народамі, якія змагаюцца супраць імперыялізму, неакаланіялізму, сіянізму і расізму. Верны антыімперыялістычным традыцыям алжырскага народа, НСАМ прымае актыўны ўдзел у рэгіянальных і сусветных форумах прагрэсіўнай моладзі, на парадку дня якіх стаялі пытанні барацьбы супраць імперыялізму, за мір, за ўсеагульнае і поўнае раззбраенне.

У апошнія гады былі падпісаны дагаворы аб супрацоўніцтве паміж НСАМ і маладзёжнымі арганізацыямі сацыялістычных і прагрэсіўных краін. У студзені 1981 года ў Маскве быў падпісаны дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве паміж ВЛКСМ і НСАМ, на аснове якога былі падрыхтаваны і падпісаны дагаворы паміж зямляцтвамі алжырскіх студэнтаў і камітэтамі камсамола навучальных устаноў СССР, дзе вучацца пасланцы алжырскай моладзі. 21 красавіка 1981 года такі дагавор быў заключаны паміж камітэтам камсамола БДУ імя У. І. Леніна і зямляцтвам алжырскіх студэнтаў, аспірантаў і стажораў, што вучацца ва універсітэце.

Галоўнай задачай мы лічым паспяховую вучобу, авалоданне сваёй спецыяльнасцю, каб, прыехаўшы на радзіму, усе свае сілы аддаць справе будаўніцтва новага грамадства ў нашай краіне.

**Фузія РАБАНІ,**
**прэзідэнт зямляцтва алжырскіх студэнтаў.**

## КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# ВЫБІРАЕМ АДКАЗНАСЦЬ

**Адбыўся сход камсамольскага актыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна, які абмеркаваў рашэнні лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС і меры па ўмацаванню дысцыпліны. З дакладам выступіў сакратар камітэта камсамола ўніверсітэта А. Рухля. У спрэчках прынялі ўдзел студэнтка мехмата Г. Краўчанка, студэнт фізфака А. Жыватко, намеснік сакратара камітэта камсамола хімфака В. Навоша, начальнік штаба працоўных спраў універсітэта А. Астапенка, сакратар камітэта камсамола НДІ ПФП А. Цыкуноў, старшыня штаба «КП» А. Шыбут, сакратар камсамольскага бюро СКТБ з ВВ А. Ганчароў.**

**На сходзе камсамольскага актыву выступіў рэктар БДУ імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі.**

**Прапануем чытачам вытрымкі з даклада А. Рухлі.**

КРЫХУ БОЛЬШ трох месяцаў прайшло з таго часу, калі завяршыў работу лістападаўскі (1982 г.) Пленум ЦК КПСС, які прымусіў усіх нас перагледзець свае адносіны да работы, вучобы, выканання сваіх абавязкаў. Адразу пасля Пленума ў камсамольскіх арганізацыях пачалося абмеркаванне і вывучэнне яго матэрыялаў у рамках адзіных палітдзён, на палітінфармацыях, у сістэме партыйнай і камсамольскай палітадукацыі. Ва ўсіх групах прайшлі камсамольскія сходы, на факультэтах — сходы актываў. Многія з выступаючых выказалі заклапочанасць станам спраў у групах, станам вучэбнай дысцыпліны, наведвання і паспяховасці. Былі выказаны некаторыя крытычныя заўвагі ў адрас камітэтаў камсамола факультэтаў і ўніверсітэта па пытаннях камсамольскай работы, кіраўніцтва вучэбнымі групамі, планавання мерапрыемстваў, фарміравання СБА. У цяперашні час крытычныя заўвагі абагульнены, прымаюцца канкрэтныя меры па іх рэалізацыі.

Зусім нядаўна скончылася сесія. Цяпер у групах, на курсах, факультэтах праводзіцца аналіз яе вынікаў, нехта ліквідоўвае «хвасты», нехта перажывае няўдачу, а ёсць і такія, што проста спачываюць на лаўрах. Давайце разгледзім рэзультаты сесіі ў цэлым па універсітэту: абсалютная паспяховасць складае 92,5 працэнта, што на 0,9 працэнта ніжэй, чым рэзультаты аналагічнай сесіі мінулага года. Самая высокая абсалютная паспяховасць— на гістарычным факультэце. Вышэй сярэдняга ўзроўню паспяховасць на юрфаку, мехмаце, хімфаку. А самая нізкая—88 працэнтаў на біяфаку і ФПМ. Цяжка, зразумела, аналізаваць ролю камсамольскіх арганізацый у дасягненні гэтых рэзультатаў, ды яна, бадай, і не заўсёды прыкметна. Гэта часткова абумоўлена недастаткова дакладна пастаўленай работай вучэбнага аддзела камітэта камсамола. Але некаторы аналіз зрабіць можна. Па-першае, за апошні год сур'ёзна павысілася патрабавальнасць за пропускі заняткаў, за бягучую паспяховасць. Толькі на ўзроўні камітэта камсамола універсітэта разгледжаны 74 персанальныя справы за парушэнне вучэбнай дысцыпліны. У выніку — 46 строгіх вымоў з занясеннем ва ўліковую картачку, вымоў і іншых спагнанняў — 28. На камсамольскіх сходах груп, на пасяджэннях ВВК разгледжана больш 300 выпадкаў слабай паспяховасці. Гэтыя меры, канешне, даюць рэзультаты. Актывізавалі сваю работу штабы «КП», часцей сталі праводзіцца рэйды ВВК і акадэмсектараў. Больш эфектыўнай стала дапамога адстаючым. Дарэчы, аб наведванні заняткаў: 7 і 25 снежня «КП» праверыў каля паловы студэнтаў на прадмет наведвання заняткаў. Высветлілася, што колькасць адсутнічаючых склала адпаведна 436 і 412 чалавек, а яшчэ 307 і 216 чалавек спазніліся на 5—45 мінут. Прозвішчы спазніўшыхся і адсутнічаючых былі перададзены на факультэты, але, на жаль, на гэтым справа і закончылася. Праўда, на некаторых факультэтах вывесілі спіс для ўсеагульнага агляду...

Паспяховасць па грамадскіх навуках больш высокая — 98,13 працэнта, а па марксісцка-ленінскай этыцы — 100 працэнтаў. Праўда, паспяховасць па этыцы не зусім адпавядае паперам, якія прыходзяць з міліцыі, а таксама рэзультатам праверак інтэрнатаў, рэйдаў «КП». Занадта сур'ёзны разрыў паміж тэорыяй і практыкай. І, каб скончыць размову пра сесію, — некалькі слоў пра паспяховасць камсамольскага актыву. Мы заўсёды імкнуліся і імкнёмся, каб наш актыў быў прыкладам ва ўсім, асабліва ў вучобе. Аднак па выніках апошняй сесіі амаль на ўсіх факультэтах, акрамя юрфака, гістфака і факультэта журналістыкі, былі выпадкі, што ў двоечніках і троечніках апынуліся камсоргі, члены камітэтаў камсамола факультэтаў. Сорамна нам, рабяты, за такі актыў, і мы рэкамендуем камітэтам камсамола факультэтаў падумаць аб мэтазгоднасці работы такіх актывістаў на выбарных пасадах.

Калі прагулы на прадпрыемстве наносяць дзяржаве прамую шкоду, дык пропускі заняткаў наносяць не меншую, хаця і ўскосную. Дарэчы, у нас ёсць шмат праблем і з нашымі маладымі супрацоўнікамі. 1—3 лютага «КП» правёў рэйд-праверку стану працоўнай дысцыпліны ў шэрагу лабараторый. На жаль, кіраўнікі падраздзяленняў успрынялі гэта з незадаволенасцю, і толькі «мандат» рэктарата дазволіў «пражэктарыстам» ажыццявіць праверку. Былі заўважаны спазненні на 5—10 мінут, адсутнасць на рабочых месцах. Шырока распаўсюджаны так званыя «мясцовыя камандзіроўкі» ў бібліятэку, у АН БССР, на завод. Зваротнай сувязі аб яўцы супрацоўніка ў пункт прызначэння ніхто не мае. Трэба папракнуць камітэт камсамола супрацоўнікаў за тое, што да цяперашняга часу не функцыяніруе «КП» супрацоўнікаў, і патрабаваць, каб у бліжэйшы час ён пачаў сваю работу.

Нядаўна праходзіў пленум камітэта камсамола па рабоце ў інтэрнатах, на якім мы сур'ёзна гаварылі аб нашых недахопах. Але я хачу ў некалькіх словах вярнуцца да гэтага пытання і сёння. Як справы ў нашых камсамольцаў —з паводзінамі ў быце, у інтэрнаце? Не зусім добра. У снежні мінулага года з камсамола за крадзёж асабістай маёмасці выключана студэнтка філфака Г. Белая, ужо ў гэтым годзе за п'янства выключаны з камсамола А. Шухто — гістфак. Можна было б працягваць знаёмства з «цікавымі» людзьмі, але давайце вернемся да пытання — адкуль бяруцца яны? Ад нашай з вамі абыякавасці!

Пазіцыю «абыякавых і шэрых асоб» ярка адлюстраваў у газеце «Беларускі універсітэт» нехта Н. К. Ён абвінавачвае камсамол у тым, што мы «імкнёмся ў нікуды», патрабуе спыніць выхаванне (маўляў, у школе надакучыла), працівіцца навязванню нейкіх «шаблонных паводзін». Але калі пад такімі паводзінамі разумець выкананне элементарных патрабаванняў Маральнага кодэкса будаўніка камунізму, Статута ВЛКСМ, Статута вышэйшай школы, дык я скажу, што такіх паводзін мы патрабуем і будзем патрабаваць! І будзем змагацца з рознымі адхіленнямі ад норм камуністычнй маралі, і выхоўваць парушальнікаў, а на іх прыкладзе — і іншых!

Але ці ведаем мы, як брацца за справу, якая нам даверана, за грамадскае выхаванне кожнаму на сваім месцы? Адразу скажу: не заўсёды, а часта і зусім не ведаем. Іменна таму многае залежыць ад нефармальнага, рэальна складзенага плана. Калі ёсць канкрэтны план, тады становіцца больш зразумела, як, калі і што рабіць. Бадай, самае цяжкае звяно—асабістыя комплексныя планы. Сапраўды, у асноўнай сваёй масе яны фармалізаваны, хаця, згадзіцеся, добры АКП і веданне таго, што за яго трэба будзе адказаць не толькі раз у год у час атэстацыі, а мінімум два разы ў год, дадуць унутраны штуршок кожнаму для індывідуальнага развіцця. На жаль, мала справаздач на камсамольскіх сходах груп. Мы, камсамольскія актывісты, павінны дапамагчы ў складанні АКП, нашы асабістыя планы павінны быць узорнымі. Рэкамендацый па складанню планаў шмат, але галоўная рэкамендацыя — свае асабістыя адносіны да гэтай важнай справы. Інакш, чым падрабязней рэкамендацыя — тым больш шаблону.

Наступнае важнае звяно — планы груп. Як іх скласці? Па прынцыпу: адна галава — добра, а дваццаць — лепш. Засталіся пасля заняткаў, разам абмеркавалі. Кожны ідэю падкіне. Лепшыя адабраць, і план гатоў. Не адпіска камсорга, а план групы. На жаль, часта студэнты ў групе нават не ведаюць, што ў гэтым плане ёсць: «Нешта там камсорг пісаў...» Аб якой рабоце можа ісці размова ў гэтай групе?

Пытанні эканоміі і беражлівасці стаяць у цэнтры ўвагі лістападаўскага Пленума ЦК КПСС. Размова аб нашых адносінах да народнага дабра, дзяржаўнай маёмасці адбылася на пленуме камітэта камсамола па рабоце ў інтэрнатах, таму падрабязна спыняцца на гэтым не буду. Напомню толькі — сесія прайшла, наперадзе цэлы семестр, давайце больш строга адносіцца да таго, чым бясплатна забяспечвае нас дзяржава. Давайце ўспомнім пра нашы абяцанні стварыць рамонтныя брыгады ў інтэрнатах, давайце адносіцца да ўсяго па-гаспадарску, а не так, як, напрыклад, адносіцца да сваёй работы студсавет інтэрната № 5, дзе бытавыя пакоі захламлены, кухні — у антысанітарным стане, дрэнна арганізавана дзяжурства. Няхай гэты студсавет зробіць вывады з апошняга рэйду «КП».

Як справядліва адзначалася на лістападаўскім Пленуме ЦК КПСС, аднымі заклікамі і лозунгамі справу з месца не зрушыш. Трэба працаваць, а нам, камсамольскім лідэрам, — удвая больш.

# 2. СУЧАСНАСЦЬ ГІСТОРЫІ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

*У студэнтаў пятага курса аддзялення гісторыі некалькі дзён назад адбылося размеркаванне. У хуткім часе раз'едуцца яны ў розныя куткі рэспублікі, каб ужо ў новай якасці, у якасці настаўніка, перадаваць сваім вучням веды, набытыя ва універсітэце. Гэта заўтра. А сёння — апошнія лекцыі, спецкурсы, факультатывы.*

*З аўдыторыі, што на шостым паверсе, далятаюць гукі музыкі. Адкрываем дзверы — і нас сустракае бадзёрае «Добры дзень!» Дзяўчаты-другакурсніцы з будаўнічага атрада «Глорыя» сабраліся сёння на сход.*

*— Якія пытанні абмяркоўваем? — Алена Ласкевіч, камандзір атрада, на хвіліну становіцца задуменнай. — Самыя розныя: сацыялістычныя абавязацельствы і тэхніку бяспекі, састаў атрада і шэфскую работу...*

*У мінулым годзе Алена ўпершыню надзела форму байца СБА—працавала ў Мінскай вобласці. Сёлета ёй ужо самой дaручылі ўзначальваць атрад. А гэта ні многа, ні мала трыццаць адзін чалавек. І месца дыслакацыі новае — Віцебская вобласць. Таму і стараецца яна разам з камісарам атрада Наташай Раманавай ужо ў падрыхтоўчы перыяд запаліць байцоў адной мэтай — працаваць па-ўдарнаму.*

*— Дзяўчаты спадзяюцца, што трапяць у першую тройку сярод СБА факультэта, — дадае камандзір.*

*І хочацца пажадаць «Глорыі» поспехаў.*

*На гістарычным факультэце значная ўвага ўдзяляецца навуковай рабоце студэнтаў. У гэтым мы пераканаліся яшчэ раз, калі завіталі на пасяджэнне гуртка СНТ «Старажытны свет і сучаснасць». Удзельнікі гуртка гаварылі аб антычнай міфалогіі, аб адлюстраванні міфаў і легенд старажытнага свету ў работах мастакоў эпохі Адраджэння і рускіх майстроў жывапісу, дэманстравалі слайды з карцінамі Васняцова, Сярова. І, што галоўнае,— кожную думку стараліся дастасаваць да дня сённяшняга, да нашага часу.*

*...Мы пакідалі гістарычны факультэт, калі зімовы вечар запаліў ва універсітэцкіх вокнах святло. Спяшаліся на заняткі студэнты-вячэрнікі, удзельнікі факультэцкага хору спрабавалі ўзяць непаслухмяную ноту сі, спрачаліся аб нечым маладыя навукоўцы... Дзень заўтрашні абяцаў быць багатым на задумы і здзяйсненні.*

**Г. ГРЭЛЬ,**
**В. ШАЧАК.**
**Фота аўтараў.**





# Бясспрэчны лідэр

ДВА ДНІ праходзіла першынство універсітэта па лёгкай атлетыцы ў закрытым памяшканні. Іменна ў гэтым відзе спорту можна набраць больш ачкоў, чым ва ўсіх астатніх відах, у залік спартакіяды. Трэба адзначыць, што некаторыя мацнейшыя лёгкаатлеты не ўдзельнічалі ў спаборніцтвах, яны выступалі на першынстве Белсавета ДСТ «Буравеснік». Камандам за іх рабілі пераразалік.

Па-ранейшаму лідэрам у лёгкай атлетыцы з'яўляецца механіка-матэматычны факультэт. Спартсмены мехмата занялі высокія месцы ва ўсіх відах праграмы. Чатыры бягунні гэтага факультэта на дыстанцыі 300 метраў паказалі лепшыя вынікі. І толькі ў апошнім забегу студэнтка фізфака Ала Пількова змагла ўмяшацца ў барацьбу за ўзнагароды і заняць другое месца. А перамагла Аксана Люцко — 43,5 секунды. Трэцяй была Святлана Крупянкова, якая святкавала поспех на дыстанцыі, у два разы даўжэйшай — 1 мінута 41,9 секунды. Люцко была трэцяй, а другой — Таццяна Баярка (ФПМ).

Такое становішча склалася і ў скачках у даўжыню сярод мужчын, дзе зноў гаспадарылі мехматаўцы. Лепшы вынік быў у Ігара Ананьева — 6 м 24 см. Калі дадаць, што спартсмены механіка-матэматычнага факультэта выйгралі абедзве эстафеты, то стане зразумелым іх бясспрэчнае лідэрства.

Двойчы паспяхова стартаваў студэнт біяфака А. Масіна. Спачатку ён выйграў бег на 60 м — 6,8 секунды, а затым на 300 м — 37,8 секунды. Сярод дзяўчат у спрынце лепшай стала Вольга Лугаўская (фізфак) — 7,7 секунды.

У гэтыя дні вельмі стараўся Аляксандр Міхалёнак, студэнт гістарычнага факультэта. Саша спачатку быў другім у бегу на 600 м, уступіўшы таварышу па камандзе Андрэю Трабушэўскаму. А назаўтра Міхалёнак лёгка выйграў самую доўгую дыстанцыю на першынстве — 1000 метраў — 2 мін. 37 секунд і ўпершыню выканаў нарматыў першага разраду.

Доўга працягвалася барацьба ў сектары для скачкоў у вышыню. Уперад выходзілі то І. Папоў, то І. Ulаноўскі з факультэта радыёфізікі і электронікі. Але ўсё ж перамог Андрэй Шахлевіч з ФПМ — 1 м 95 см,



на 5 сантыметраў апярэдзіўшы Папова.

У дзяўчат у гэтым відзе спорту сабралася ўсяго пяць чалавек. А вышэй за ўсіх узляцела над планкай Таня Вітавец (ФПМ) — 1 м 70 см.

Не было роўных А. Драздоўскаму у штурханні ядра (факультэт радыёфізікі і электронікі), які штурхнуў снарад на 14 м 77 см. На жаль, яго ніхто не падтрымаў высокімі рэзультатамі. Таксама і Наташа Бяжок (філфак) далёка адарвалася ад саперніц. Яна аж на 80 см скокнула далей за другога прызёра.

Гаворачы аб каманднай барацьбе, трэба адзначыць, што нечакана «вядучыя» факультэты выступілі даволі роўна. Так, трэцюю і чацвёртую каманды раздзялілі 7,5 ачка, а фізфак адстаў ад факультэта радыёфізікі і электронікі ўсяго на адно ачко. Арганізаванасць прынесла поспех юрыдычнаму факультэту, які з трэцяга месца ў мінулым годзе перамясціўся на другое.

Прыводзім табліцу першынства універсітэта па лёгкай атлетыцы. Набраныя факультэтамі ачкі ідуць у залік спартакіяды.

| | | |
|---|---|---|
| 1. | Мехмат | 394 |
| 2. | Юрфак | 289,5 |
| 3. | ФПМ | 214 |
| 4. | Факультэт радыёфізікі і электронікі | 206,5 |
| 5. | Фізфак | 205,5 |
| 6. | Гістфак | 190,75 |
| 7. | Хімфак | 178,5 |
| 8. | Біяфак | 62 |
| 9. | Геафак | 45,5 |
| 10. | Філфак | 33 |

Факультэт журналістыкі ў спаборніцтвах удзелу не прымаў.

**І. УЛАДЗІМІРАЎ.**



# НАША ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ

**1. Які парадак высялення з інтэрнатаў, прадугледжаны заканадаўствам?**

У адпаведнасці з артыкулам 41 Асноў жыллёвага заканадаўства Саюза ССР і саюзных рэспублік, якія ўступілі ў дзеянне з 1 студзеня 1982 года, грамадзяне, што вучыліся ў навучальных установах і выбылі з іх, падлягаюць высяленню без прадастаўлення іншай жылой плошчы з інтэрната, у якім яны жылі ў сувязі з вучобай.

Іншыя работнікі, якія пасяліліся ў інтэрнаце ў сувязі з работай, могуць быць выселены без прадастаўлення іншай жылой плошчы ў выпадку звальнення па асабістаму жаданню без уважлівых прычын, за парушэнне працоўнай дысцыпліны ці здзяйсненне злачынства. Спыніўшыя работу па іншых прычынах могуць быць выселены толькі з прадастаўленнем іншай жылой плошчы.

**2. З якога часу змяняецца аклад работнікаў вышэйшых навучальных устаноў пры дасягненні адпаведнага стажу навукова-педагагічнай работы?**

У адпаведнасці з параграфам 5 Інструкцыі аб парадку правядзення падліку стажу навукова-педагагічнай работы для назначэння пасадавых акладаў работнікам навукі змена акладу ў залежнасці ад стажу навукова-педагагічнай работы праводзіцца з дня дасягнення адпаведнага стажу, калі дакументы, неабходныя для своечасовага і правільнага падліку стажу знаходзяцца ў навукова-даследчай ці вышэйшай навучальнай установе, або з дня падачы дакументаў аб стажы, які дае права на павышэнне пасадавага акладу.

**Т. БЯЛОВА,**
**дзяжурная па кансультацыі, выкладчык кафедры грамадзянскага працэсу і працоўнага права.**

# СВЯТЛО НАРОДНАЙ ПЕСНІ

**...У КАЛІДОРЫ ЧУТНО шматгалоссе хору. Гучыць песня аб непарушнай дружбе і брацтве саюзных рэспублік нашай шматнацыянальнай краіны... Ідзе рэпетыцыя хору народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Спевакі уважліва выконваюць свае партыі, адпрацоўваюць суладнасць гучання. Спяваюць лёгка, з захапленнем.**

**У перапынку я звярнулася да кіраўніка хору Ларысы Віктараўны Снапковай:**

**— Ларыса Віктараўна, скажыце, калі ласка, як Вам працуецца ў гэтым калектыве?**

— Працую я на кафедры народных спеваў Мінскага інстытута культуры. Хорам кірую на грамадскіх асновах. Радуе мяне, што ўдзельнікі хору любяць народную песню. Зараз працуем і над харэаграфіяй. Нацыянальныя касцюмы дазваляюць перадаць песню ў дынаміцы, вобразах, надаць ёй своеасаблівы каларыт.

**— А якія песні ўключаеце ў свой рэпертуар?**

— Рэпертуар наш паступова расшыраецца. Спачатку былі дзве—тры песні, з якімі мы выступалі. Цяпер — амаль двухгадзінная праграма, у якую ўваходзяць песні, прысвечаныя 60-годдзю з дня ўтварэння СССР — «Праздничный тост», «Союз республик — Родина моя», беларускія народныя «Ой, сівы конь бяжыць», «Велічальная», украінская народная песня «Ой, у вішнэвыму садочку», руская народная песня «На горе-горе береза» і іншыя.

**Да нашай гаворкі далучаюцца ўдзельнікі хору, яго ветэраны. Звяртаемся да Віктара Карнеевіча Ахраменкі:**

**— Скажыце, калі ласка, з чаго пачынаўся хор?**

— Пачатак быў пакладзены чатыры гады назад, калі вырашылі стварыць харавы калектыў на фізічным факультэце. Выпадкова знайшлі чалавека, які згадзіўся на грамадскіх асновах кіраваць. У 1981 годзе на аснове калектыву стварылі агульнауніверсітэцкі народны хор. Спевакі — у асноўным супрацоўнікі і выкладчыкі механіка-матэматычнага, фізічнага факультэтаў, навукова-даследчых інстытутаў, кафедры замежных моў, факультэтаў журналістыкі і прыкладной матэматыкі.

**— Віктар Карнеевіч, што, на Ваш погляд, галоўнае ў дзейнасці хору?**

— Перад намі стаіць задача не толькі выступаць на ўрачыстасцях ва універсітэце. Мы выязджалі з канцэртам у падшэфны калгас Уздзенскага раёна. Тут выявіліся сярод нас не толькі добрыя спевакі, але і чытачы. Уважліва слухалі калгаснікі урыўкі з паэмы Я. Коласа «Новая зямля», якія прачытаў Мікола Рыгоравіч Каваленка. У мінулым годзе студэнты Мінскага інстытута культуры абаранялі дыпломныя работы на аснове нашага хору. Адказным было выступленне ў інстытуце з песнямі, падрыхтаванымі дыпломнікамі. Мы вельмі рады былі пачуць, што абарона прайшла на выдатна.

**У размову ўступае стараста хору Рэгіна Антонаўна Міхайлава:**

— За добрую працу мясцком узнагародзіў нас паездкай на Байкал. Там мы па-сапраўднаму адчулі, што беларускія народныя песні любяць і ведаюць не толькі ў Беларусі. Сардэчна нас прымалі гаспадары. За выступленне былі ўзнагароджаны Ганаровай граматай кіраўніцтва экскурсійнага бюро. Гэтая паездка дала нам вялікі творчы запал, натхніла на далейшую працу.

**Звяртаемся да салісткі Святланы Аляксандраўны Карасцялёвай:**

**— Святлана Аляксандраўна, на мой погляд, кожнаму калектыву трэба мець у сваім рэпертуары не толькі харавыя нумары, але і сольныя. Раскажыце, калі ласка, аб вашых салістах, аб сабе.**

— Падрыхтаванымі спецыялістамі прыйшлі ў хор Ларыса Іосіфаўна Сарафіновіч, Віктар Карнеевіч Ахраменка. Ларыса Лукінічна Бярозкіна, якая спявала ў акадэмічнай капэле, зараз з'яўляецца вядучым голасам у партыі альтоў. Заўсёды падабаюцца гледачам песні ў выкананні Аляксандры Уладзіміраўны Гарблюк. Што ж датычыцца асабіста мяне, то калі прыйшла ў хор, упершыню пачула і адчула народную манеру выканання. Здаецца, яна даступная для кожнага чалавека. Я атрымліваю аднолькавае задавальненне і ад рэпетыцый і ад канцэртаў.

**...Рэпетыцыя працягваецца. Здаецца, сама песня асвятляе твары выканаўцаў.**

**Цяжка выпрацаваць шматгалоссе беларускай народнай песні, гармонію гучання, знайсці самабытнасць выканання, каб кожны ўмеў спяваць і слухаць другога. Наперадзе — праца, творчы пошук. Але любоў да народнай песні дапаможа спевакам.**

**А. ПЕКАР,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**





# ГАЛАСЫ НАД НЁМАНАМ

## У НАС У ГАСЦЯХ ЛІТАРАТУРНАЕ АБ'ЯДНАННЕ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

НЕКАЛЬКІ ГАДОЎ пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце працуе літаратурнае аб'яднанне «Наднёманскія галасы», якім кіруе былы выпускнік філфака БДУ імя У. І. Леніна, кандыдат філалагічных навук, паэт Міхась Губернатараў.

У 1980 годзе літаб'яднанне выпусціла ў свет сваю першую друкаваную кніжку вершаў «Наднёманскія галасы». Многія яе аўтары ўжо развіталіся з вясёлай студэнцкай сям'ёй, а на іх месца прыйшлі зусім яшчэ маладыя юнакі і дзяўчаты з паэтычнай іскрынкай у сэрцы. Са сваімі вершамі студэнты неаднаразова выступалі ў друку, па абласному радыё, рэспубліканскаму тэлебачанню.

Для іх творчасці характэрна свая юначая шчырасць. Пачаткоўцы натхнёна ўслаўляюць мясціны свайго дзяцінства, чыстае і светлае пачуццё на зямлі — студэнцкае каханне, хараша і канкрэтна апяваюць прыроду роднай Гродзеншчыны. Вершы старшакурснікаў Юрыя Ленца, Таццяны Лісіцынай, Надзеі Горбік, Наталлі Лісоўскай, Валянціны Пастэрнак багатыя метафарамі і параўнаннямі, яны вабяць чытача сваёй непасрэднасцю.

Сёлета да «Наднёманскіх галасоў» прыйшло маладзейшае папаўненне: Пётр Семінскі, Ірына Ціхан, Марыя Лукашэвіч, Рэгіна Місура. У кожнага з іх свае паэтычныя вобразы, сваё цікавае бачанне свету, што з цягам часу і будзе стымуляваць рост іх майстэрства. Сёння чытачоў «Беларускага універсітэта» хочацца пазнаёміць з новымі вершамі студэнтаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта.

**Сяргей ЧЫГРЫН.**

### НАДЗЕЯ ГОРБІК

***

З першым вясковым громам,
З ліўнем цёплым, з маланкай,
З свежым, зялёным ранкам
Віншую сваіх знаёмых.
Кожны з іх усміхнецца...
Раптам прышчышу крокі—
Песня спее ў сэрцы,
Просіцца ў свет шырокі.

### РЭГІНА МІСУРА

***

Люблю дражніцца з рэхам у бары,
Я тут заўсёды госць жаданы.
Дадому лесу я нясу дары
З арэшын звонкіх і палян духмяных.
Хачу абняць я сіні небасхіл
І выпесціць рукамі кожны колас,
Я пад цымбалы люстраной Гаўі
Пачуць салоўкі сакавіты голас.
Пабачу земляка — не праміну,
Не хопіць часу нам нагаварыцца.
І добрым словам вёску ўспамяну —
Майго жыцця гаючую крыніцу.

### ТАЦЦЯНА ЛІСІЦЫНА

***

Гарыць лісцё сваім агнём апошнім,
Але даўно — у хмарках далячынь.
Сумуе ў адзіноце ціха пожня,
І вые вецер глуха ўначы.
Зрывае з дрэў чаканкі-залатоўкі
І кідае на жухлую траву.
Завеі — белакосыя сяброўкі
Вось-вось у танцы белым паплывуць.

***

Адшапацела сваё ніва.
На ўзмежку кветкі адцвілі.
Збірае верасень руплівы
Даніну з матчынай зямлі.
Зноў павуцінак валаконцы
Рукой нябачнай восень тчэ.
Іржэўнік свеціцца пад сонцам —
І поле дыхае лягчэй.



### ЮРЫЙ ЛЕНЕЦ

#### РОДНАМУ КРАЮ

Малюнка дзіўны полаг
Завесіць небасхіл.
І дождж сыпне з прыполу,
Каб змыць
Усе грахі.
Гучаць, як на паверцы,
У сто рагоў
Грамы,
І абнаўляюць сэрцы
І людзі,
І дамы.

#### ПРАГА

Вецер на струнах лясоў шумна грае,
Рукі па цэлай зямлі распасцёр.
Чуеце? Кліча вясна маладая,
Каб пачыналі жыццё!
Сонца праменні свае разаслала
Вокны закрытыя біць...
Свет — гэта сцэна,
Ні многа, ні мала,
Дзе не прытворышся жыць.
Дык напаўняйцеся вечнаю прагай!—
Коснасці, шэрасці—бой!
Будзьце мяцежнай вясенняй
адвагай —
Станьце самімі сабой!

### ВАЛЯНЦІНА ПАСТЭРНАК

***

Мне раптам захацелася дахаты,
Дзе пах чаромхі ўперамешку з мятай.
Пясок ля ганку сыпкі і гарачы.
Па ім сястрычка-верабейчык скача.
Мяне сустрэне маці на падворку
І пра навіны павядзе гаворку,
І малака падасць у гладышу...
Спытае ціха, рэдка што пішу.
Мне раптам захацелася дахаты—
У сад ружовы, на чмялёў багаты,
Дзе мне любая яблыня—сястра,
У кожнай з іх дзявочая пара...
Мне раптам захацелася дахаты...



### ІРЫНА ЦІХАН

#### ВОСЕНЬ

Затаіўся вецер.
У полі — смутак:
Восень плача —
Згубіла абутак.
Жар у косы
Запляла бярозе.
Паехала па лесе
У стракатым возе.

Хмурна пазіраюць
Крохкія рабіны.
Адлятае ў вырай
Клін буслінь.
Дуб яму махае
Шапкай ледзяною,
А за лесам поле
Трызніць бараною.

### НАТАЛЛЯ ЛІСОЎСКАЯ

***

Сорвалось ведро в колодце.
Плеск воды и тишина.
Лишь волна, как сердце, бьётся.
Я стою над ней одна.
Жёлт песок на той дорожке,
По которой я бегу.
Только с краю подорожник
Да репейник на беду.
Вот исколоты все ноги,
И зашмыган детский нос.
А у мамы от тревоги
Сердце вновь оборвалось.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.
10 сакавіка 1983 г.
Зак.. 483. АТ 03111

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ